# НАПАЛЕОН ОРДА: КАМПАЗІТАР, МАСТАК, ПАТРЫЁТ

## Творчая і грамадская дзейнасць славутага земляка

**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар



**Жыліцкі палацава-паркавы комплекс, што ў Кіраўскім раёне, лічыцца адным з найцікавейшых помнікаў гісторыі і архітэктуры нашай краіны. Лёс яго, як і большасці аналагічных айчынных помнікаў, складаны і драматычны. Некалі «інтэр'еры палаца вызначаліся <...> багатым убраннем. Залы і пакоі былі аздоблены пазалочанай лепкай, размалёўкай, дэкаратыўнымі тканінамі і карцінамі» [1, с. 214]. Аднак войны, рэвалюцыі, гістарычная глухата і эстэтычная неадукаванасць паслярэвалюцыйных раённых улад пазбавілі палац яго мастацкага бляску і ператварылі ў звычайны саўгас-тэхнікум.**

**На шчасце, прыйшлі лепшыя часы, і помнік вырашана было рэстаўрыраваць. Аднаўленчыя работы ўскладняла адсутнасць першапачатковых праектных дакументаў. І тут на дапамогу архітэктарам прыйшлі музейныя работнікі. Яны прадаставілі рэстаўратарам малюнкі Напалеона Орды. Увогуле ж мастацкая спадчына гэтага таленавітага і высокаадукаванага чалавека ўтрымлівае каля 200 выяў беларускіх маёнткаў, замкаў, палацаў, паркаў. Усе творы вызначаюцца строгай дакументальнасцю, а таму маюць вялікую каштоўнасць для гісторыі нацыянальнай архітэктуры.**

### ✍ У шэрагах барацьбітоў за вызваленне

Жыццё і творчасць Напалеона Орды (1807–1883 гг.) цесна знітавана з гісторыяй нашай Радзімы. Нарадзіўся гэты выдатны чалавек у вёсцы Варацэвічы Пінскага павета ў сям'і інжынера-фартыфікатара. Відаць, ад бацькі атрымаў першыя навыкі малявання. Пасля завяршэння першапачатковай дамашняй адукацыі вучыўся ў славутай Свіслацкай гімназіі (пазней яе скончыў Кастусь Каліноўскі). Галоўнай мэтай свайго жыцця юнак лічыў барацьбу з царскім самаўладдзем за вызваленне Айчыны ад дэспатызму, таму без ваганняў стаў удзельнікам тайнага вучнёўскага таварыства «Заране», якое ў Свіслачы заснаваў Фелікс Ляховіч.

Закончыўшы ў 1823 г. гімназію, Н. Орда паступіў у Віленскі ўніверсітэт, дзе неўзабаве ўступіў у студэнцкае тайнае таварыства. Членамі гэтага радыкальнага згуртавання патрыятычна настроенай студэнцкай моладзі былі Тамаш Зан, Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Юзаф Яжоўскі і інш. У канспіратыўных мэтах юнакі клікалі адзін аднаго імёнамі славутых суайчыннікаў: Вітаўта, Ягайлы, Гедыміна, Тадэвуша Касцюшкі і інш. І ў паўсядзённым жыцці члены таварыства імкнуліся быць падобнымі да сваіх куміраў. Маладыя людзі штомесяц збіраліся на пасяджэнні, дзе рабілі даклады аб жыцці выбітных беларускіх дзяржаўных і палітычных дзеячоў, разважалі







РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб духоўных здабытках беларускага народа, спявалі народныя песні, чыталі ўласныя паэтычныя і празаічныя мастацкія творы.



Члены таварыства марылі аб незалежнасці сваёй Бацькаўшчыны, аб усталяванні на яе тэрыторыі высокаадукаванага і маральнага грамадства. Аднак царская паліцыя натрапіла на след патрыятычнага студэнцкага згуртавання. Пачалося расследаванне яго дзейнасці спецыяльнай урадавай камісіяй. Паводле вынікаў яе дзейнасці былі прыняты адпаведныя меры. Кіраўнікі таварыства (Т. Зан, Ф. Ляхоўскі, Я. Чачот) былі арыштаваны і заключаны ў турмы, а потым сасланы ў Сібір і мусілі прыняць удзел у баявых дзеяннях расійскай арміі падчас руска-турэцкай вайны. Радавых членаў таварыства – у іх ліку апынуўся і Напалеон Орда – выключылі з універсітэта. Але жорсткая расправа са студэнтамі-патрыётамі не заглушыла нацыянальна-вызваленчыя пачуцці юнака.

У 1830–1831 гг. на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы выбухнула нацыянальна-вызваленчае паўстанне. Напалеон Орда адразу далучыўся да паўстанцаў. Ён актыўна вёў вусную прапаганду сярод беларускай шляхты і іншых сацыяльных слаёў гарадскога і сельскага насельніцтва, распаўсюджваў адозвы паўстанцаў, збіраў зброю і фінансавыя сродкі для мяркуемых паўстанцкіх атрадаў. А калі пачаліся ваенныя дзеянні, стаў у шэрагі барацьбітоў з расійскімі карнымі атрадамі. У жніўні 1831 г. царскай рэгулярнай арміі на чале з графам Паскевіч-Эрыванскім удалося спыніць паўстанцкі рух. Частцы яго актыўных удзельнікаў пашчасціла пазбегнуць суровых рэпрэсій. М. Кл. Агінскі, Ігнат Дамейка, А. Міцкевіч эмігрыравалі ў розныя краіны свету. На чужыне апынуўся і Н. Орда. Спачатку яму давялося жыць у Аўстрыі, потым у Італіі і Швейцарыі.

### Гады эміграцыі

У 1833 г. Напалеон пераехаў у Парыж і пражыў тут амаль 23 гады. У Францыі ў той час знаходзілася шмат палітычных эмігрантаў, з якімі Орда хутка ўстанавіў асабістыя і творчыя кантакты. Найбольш цесныя сяброўскія адносіны ў яго склаліся з А. Міцкевічам і Ю. Крашэўскім. Вядома, што Напалеон неаднаразова акампаніраваў на фартэпіяна паэтычным імправізацыям А. Міцкевіча. Аб сяброўскіх сувязях Н. Орды і Ю. Крашэўскага сведчаць шматлікія лісты, якія сёння захоўваюцца ў асабістым архіве французскага нашчадка Напалеона Юбэра Дэнармандзі. У адным з лістоў Ю. Крашэўскага вельмі эмацыянальна і пранікнёна ацэньваецца альбом малюнкаў Н. Орды, які тады выйшаў у свет. Аўтар ліста «характарызуе зборнік як багатую крыніцу ведаў пра культуру і архітэктуру нашай краіны» [4, с. 76].

У сталіцы Францыі Н. Орда вёў надзвычай актыўнае жыццё. Архіўныя дакументы сведчаць, што ён быў членам шэрага польска-літоўскіх эміграцкіх суполак, уваходзіў у склад Парыжскага гісторыка-літаратурнага таварыства. Шмат часу Напалеон Орда займаўся выяўленчым мастацтвам у студыі славутага мастака П. Жэрара, а таксама спасцігаў фартэпіяннае майстэрства – вучыўся ў знакамітых кампазітараў Ф. Шапэна і Ф. Ліста.

Адносіны Шапэна і Орды паступова перараслі ў шчырае сяброўства. Польскі кампазітар высока цаніў музычны талент нашага суайчынніка, прысвяціў яму шэраг сваіх сачыненняў, а нярэдка і сам выконваў фартэпіянныя творы беларускага кампазітара. Менавіта Ф. Шапэн стаў ініцыятарам выдання фартэпіянных мініяцюр Н. Орды, якія ўбачылі свет у 1838 г. і карысталіся ў Еўропе вялікай папулярнасцю.

У Парыжы былі выдадзены таксама рамансы, паланэзы і песні Напалеона Орды на вершы паэтаў-суайчыннікаў – Адама Міцкевіча, Стэфана Вітвіцкага, Адама Плуга і інш. Паводле меркавання музыказнаўцаў, лепшыя творы гэтага самабытнага кампазітара вылучаюцца маштабнасцю, разнастайнасцю і багаццем фактуры, меладычнасцю, эмацыянальнай насычанасцю.

Высока ацэньваў музычную творчасць Напалеона Орды славуты венгерскі кампазітар і піяніст Ферэнц Ліст і раіў надаваць самую сур'ёзную ўвагу кампазітарскаму майстэрству. Нястомная праца па ўдасканаленні кампазітарскай і выканальніцкай дзейнасці дазволіла Н. Ордзе стаць адным з лепшых музыкантаў свайго часу. Сведчаннем прызнання яго таленту стаў той факт, што ў 1843 г. таварыства акцыянераў Італьянскай оперы ў Парыжы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прапанавала нашаму суайчынніку заняць пасаду дырэктара тэатра – аднаго з самых аўтарытэтных у Еўропе XIX ст. На гэтай высокай пасадзе Напалеон Орда шмат зрабіў для станаўлення новага рамантычнага кірунку ў еўрапейскім мастацтве. Музычная спадчына кампазітара складаецца з вялікай колькасці выдатных твораў: канцэртных паланэзаў, мазурак, вальсаў, полек, рамансаў, песень, інструментальных і вакальных мініяцюр [1, с. 68].

У парыжскі перыяд жыцця, акрамя музычнай і мастацкай творчасці, Н. Орда актыўна займаўся публіцыстычнай і педагагічнай дзейнасцю. Ён клапаціўся аб пашырэнні музычнай адукацыі сярод моладзі, у прыватнасці, адзначаў востры недахоп спецыяльнай дыдактычнай літаратуры па авалоданні музычным майстэрствам. Кампазітара непакоіла слабае валоданне музыкантамі навукай гармоніі, і таму ён лічыў сваёй задачай распрацаваць дапаможнік па асновах тэорыі музыкі.

Абапіраючыся на педагагічную думку еўрапейскіх аўтараў, Н. Орда працяглы час працаваў над стварэннем даступнага вучэбнага дапаможніка для пачынаючых музыкантаў, і ў 1873 г. у Варшаве выйшла ў свет напісаная ім «Граматыка музыкі, або Аналітычнае і практычнае выкладанне мелодыі і гармоніі з кароткім дапаўненнем аб фузе, кантрапункце, аркестравых інструментах, аб аргане, фартэпіяна і навуцы спеваў для выкарыстання піяністамі». У дапаможнік уключаны матэрыял па асновах тэорыі музыкі, гармоніі, аналізе формы, інструментазнаўстве. Урокі па тэорыі музыкі ілюструюцца пераканаўчымі музычнымі прыкладамі, прыдуманымі аўтарам альбо ўзятымі ім з твораў заходнееўрапейскіх кампазітараў. Значная ўвага ў кнізе надаецца гісторыі тэарэтычнага музыказнаўства. Н. Орда прасачыў развіццё музыказнаўчай думкі ад Антычнасці да XIX ст., прааналізаваў станаўленне гармоніі ад Сярэднявечча да І. С. Баха, Ф. Шапэна. Дапаможнік гэты быў высока ацэнены вядомым





польскім кампазітарам С. Манюшкам: «З асалодай чытаў работу па гармоніі, выкладанне якой, мне падаецца, найбольш поўнае і даступнае для разумення» [3, с. 209]. Такі водгук славутага кампазітара, які, дарэчы, і сам з'яўляецца аўтарам некалькіх дыдактычных прац, сведчыць аб высокім тэарэтыка-метадычным узроўні працы нашага суайчынніка.

На працягу ўсяго жыцця Напалеона Орды яго не пакідалі клопаты аб пашырэнні мастацкай адукацыі беларускай моладзі. Так, вярнуўшыся ў 1856 г. на радзіму, ён апекаваў навучэнцаў Пінскай гімназіі. У яго тэстаменце, які захоўваецца ў архіве сям'і Дэнармандзі, маецца артыкул № 1: «Я адпісваю дзве тысячы рублёў для выплаты стыпендыі ад імя Напалеона Орды двум вучням Пінскай гімназіі. Такім чынам, працэнты ад гэтай сумы пойдуць на вучобу і набыццё падручнікаў для гэтых вучняў, рэштку ад гэтай сумы трэба аддаць хлопчыкам пасля таго, як здадуць экзамен на бакалаўра, каб яны змаглі працягнуць сваю вучобу» [4, с. 77].

## Зноў на радзіме

На радзіму пасля вымушанага 23-гадовага расстання з ёй палітычны выгнаннік вяртаўся з хваляваннем. Пэўны час ён працаваў дамашнім настаўнікам у шляхецкіх сем'ях. Увесь свой вольны час аддаваў вандроўкам па беларускіх гарадах і вёсках, музычнаму і асабліва выяўленчаму мастацтву.

Напрыканцы XIX стагоддзя магутная ідэйна-мастацкая плынь рамантызму ахапіла ўсе віды еўрапейскага, у тым ліку і беларускага, мастацтва. Паэты, мастакі, кампазітары, філосафы, гісторыкі актыўна звярталіся да народнай культуры, да нацыянальнай гісторыі. Моцная цікавасць да этнаграфічных артэфактаў адчуваецца і ў мастацкіх творах Напалеона Орды. Невялікія па фармаце малюнкі алоўкам, часам падмаляваныя акварэллю, гуашшу, сепіяй, з'яўляюцца своеасаблівай ілюстрацыяй жыцця беларускай вёскі XIX ст. З гэтых лістоў на

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



нас глядзяць драўляныя хаты пад вальмавымі або паўвальмавымі стрэхамі, сціплыя вясковыя цэркаўкі, вадзяныя млыны, зрубныя калодзежы з традыцыйным «жураўлём», рэчачкі з пераправамі і г. д. Беларуская народная архітэктура адлюстравана аўтарам з велізарнай цеплынёй, трапнасцю, захапленнем нацыянальным каларытам.

Змест значнай часткі малюнкаў Напалеона Орды – сядзібная архітэктура. Занатаваныя на іх будынкі пераважна звязаны з імёнамі славутых сыноў Беларусі М. Кл. Агінскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, С. Манюшкі, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, І. Ходзькі і інш. Большасць з гэтых твораў былі апублікаваны ў польскім часопісе «Тыгоднік ілюстраваны» пад рубрыкай «З папкі Напалеона Орды». Са значнай часткай малюнкаў мастака грамадскасць еўрапейскіх краін пазнаёмілася ў 1873–1883 гг., калі ў варшаўскай майстэрні М. Фаянза былі выдадзены восем серый альбомаў з работамі Н. Орды.

Вялікую гістарычную каштоўнасць уяўляюць для нас таксама архітэктурныя пейзажы шэрага беларускіх гарадоў: Мінска, Гродна, Віцебска, Магілёва, Навагрудка, Нясвіжа, Кобрына, Пінска.

Асаблівы і надзвычай цікавы пласт выяўленчай спадчыны Напалеона Орды – відарысы беларускіх замкаў. Мастак заспеў неразбураныя яшчэ велічныя збудаванні ў Крэва, Геранёнах, Навагрудку, Гальшанах, Міры, Нясвіжы, Смалянах, Караліна. Іх назаўсёды страчаны для нас свет утвораны архітэктурнай непаўторасцю атачэння: паркаў, рэчачак, сажалак, алей.

Велічныя палацы, якія ўзводзіліся на нашай тэрыторыі ў XIX ст. пад уплывам неараманскага і неагатычнага стыляў, таксама аказаліся ў сферы творчых інтарэсаў нястомнага мастака-вандроўніка. Шматлікія малюнкі дакладна і пераканаўча даносяць да нас унікальную прыгажосць, аб'ёмна-прасторавую структуру палаца-паркавых сядзіб у Астрашыцкім Гарадку, Вярдомічах, Горнах, Дзявяткавічах, Пружанах, Прылуках, Станькаве.

Асаблівае месца ў творчай спадчыне Напалеона Орды займаюць выявы збудаванняў культавай архітэктуры. Гэта і помнікі драўлянага дойлідства, і мураваныя храмы ў старажытнарускім стылі, і храмы ранняга барока. Менавіта дзякуючы гэтаму самаадданаму прапагандысту родных краявідаў захавалася для нас непаўторнае аблічча драўляных храмаў у Анопалі, Брашэвічах, Бярэзніцы, Моладаве, Пінску. У пераважнай большасці гэта невялікія будынкі з прамавугольнымі ў плане зрубамі і двухсхільнымі дахамі. Бясспрэчную навуковую каштоўнасць маюць выявы Барысаглебскай царквы ў Навагрудку, выкананыя да яе перабудовы ў другой палове XIX ст., гатычных храмаў XV–XVII стст. у в. Ішкальдзь Баранавіцкага раёна і ў Дзяржынску, базыльянскага манастыра, Багаяўленскай і Крыжаўздвіжанскай цэркваў у Жыровічах, езуіцкіх касцёлаў у Полацку і в. Фашчака Шклоўскага раёна, Троіцкага касцёла ў Ружанах.

Сёння, на жаль, многія помнікі, зафіксаваныя ў творах гэтага таленавітага пейзажыста, моцна разбураны, зусім знішчаны або кардынальна перабудаваны. Узнавіць іх першапачатковы аўтэнтычны выгляд мастацтвазнаўцам і рэстаўратарам дапамагаюць малюнкі выдатнага мастака і грамадзяніна Напалеона Орды.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Архітэктура Беларусі:** энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993.
2. **Ахвердава, А.** Пачынальнікі беларускага піянізму / А. Ахвердава // Мастацтва Беларусі. – 1985. – № 2. – С. 67–70.
3. **Дадзіёмава, В. У.** Гісторыя музычнай культуры Беларусі да XX стагоддзя / В. У. Дадзіёмава. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2012. – 230 с.
4. **Жылевіч, В.** Невядомы Напалеон Орда. Французскія дакументы да біяграфіі з архіва сям'і Дэнармандзі / В. Жылевіч // Роднае слова. – 2017. – № 2. – С. 75–77.
5. **Капилов, А. Л.** Музыкальная культура Беларуси XIX начала – XX веков / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск: Институт современных знаний, 2000. – 144 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ